УДК 271.2-9-727(47+57)«1929»

**Н. І. Казлова**
*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны», Гомель*

# II УСЕСАЮЗНЫ З'ЕЗД БЯЗБОЖНІКАЎ І ЗМЕНЫ Ў АНТЫРЭЛІГІЙНАЙ ПРАЦЫ

**Уводзіны.** Першае савецкае дзесяцігоддзе стала адным з самых трагічных перыядаў у гісторыі ўзаемаадносін царквы і дзяржавы. Гэта быў час, калі зачыняліся храмы, а іх памяшканні выкарыстоўваліся ў грамадскіх мэтах, праводзіліся кампаніі па ўскрыцці святых мошчаў і канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей, выпрацоўваліся формы і метады антырэлігійнай агітацыі і прапаганды. Асаблівую ролю ў справе выкаранення і вынішчэння рэлігіі адыграла масавая грамадская арганізацыя «Саюз бязбожнікаў СССР» (далей — СБ), цэнтралізаванае кіраванне якой ажыццяўлялася з Масквы. Важнае значэнне ў справе стварэння саюза адыграла створаная ў 1922 годзе газета «Бязбожнік», якая ў кароткія тэрміны абрасла масавай аўдыторый (чытачамі і карэспандэнтамі). Ужо ў жніўні 1924 года намаганнямі апошніх было створана Таварыства сяброў газеты «Бязбожнік». На I з'ездзе таварыства, які адбыўся ў красавіку 1925 года, быў створаны «Саюз Бязбожнікаў СССР», галоўнай мэтай якога стала змаганне з рэлігіяй ва ўсіх яе праявах. Так, на чэрвень 1929 года было запланавана скліканне II Усесаюзнага з'езду бязбожнікаў, які павінен быў стаць значным крокам бязбожнага руху. Ад яго вынікаў залежала далейшае накіраванне антырэлігійнай працы. Мэта даследавання — прааналізаваць дзейнасць і асноўныя рашэнні II Усесаюзнага з'езду СБ, прасачыць змены, якія адбыліся ў антырэлігійнай прапагандзе. Пры даследаванні дадзенай праблематыкі былі выкарыстаны працы такіх даследчыкаў, як Д. В. Паспялоўскі, В. А. Аляксееў, А. А. Слезін, С. Л. Фірсаў, якія на аснове крыніц ахарактарызавалі дзейнасць II з'езду СБ. Таксама пры напісанні дадзенага артыкула выкарыстоўваліся матэрыялы дакладаў удзельнікаў з'езду. Артыкул грунтуецца і на аснове архіўных матэрыялаў з Дзяржаўнага архіва грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці, матэрыялах газет «Безбожник» і «Антирелигиозник» [1—12].

**Асноўная частка.** Пачынаючы з 1925 года адным з галоўнейшых інструментаў ідэалагічнай палітыкі, накіраванай на разбурэнне рэлігійнага светапогляду савецкага насельніцтва, стаў СБ, апагеем дзейнасці якога можна лічыць II з'езд бязбожнікаў, які прайшоў у чэрвені 1929 года. Ад яго вынікаў залежаў далейшы кірунак антырэлігійнай працы. А 27 мая 1929 года пытанне аб скліканні з'езду разглядалася на пасяджэнні палітбюро. Было вырашана стварыць камісію для разгляду тэзісаў па дакладах, у якую ўвайшлі А. І. Крыніцкі, М. І. Бухарын і Я. Яраслаўскі; М. І. Бухарыну было даручана выступіць на адкрыцці з'езду ад імя ЦК партыі [1, с. 54]. Гэтаму з'езду папярэднічалі рэгіянальныя з'езды, дзе праводзілі выбары дэлегатаў, якія прадстаўлялі мясцовыя ячэйкі СБ [2, арк. 2]. Так, з 11 па 15 чэрвеня 1929 года ў Маскве адбыўся II Усесаюзны з'езд СБ СССР, у якім прынялі ўдзел 1 200 дэлегатаў (сярод якіх было 109 сялян, 264 рабочых, 575 служачых і навучэнцаў) [3]. Удзельнічалі таксама і запрошаныя дэлегацыі Інтэрнацыянала пралетарскіх вальнадумцаў (ІПВ) з Аўстрыі, Бельгіі, Германіі, Францыі і інш. Так, II Усесаюзны з'езд бязбожнікаў прыняў рашэнне аб перайменаванні арганізацыі ў «Саюз ваяўнічых бязбожнікаў» (далей — СВБ). Гэта стала найбольш яркім знешнім паказчыкам пераходу ўлады да больш актыўных антырэлігійных дзеянняў. «Зварот II Усесаюзнага з'езду ваяўнічых бязбожнікаў СССР да ўсіх рабочых, сялян і чырвонаармейцаў СССР» быў пранікнуты нецярпімасцю да рэлігіі: «Для нас барацьба на антырэлігійным фронце ёсць толькі адзін з відаў класава-палітычнай барацьбы, якую праводзяць працоўныя супраць капіталу» [4, арк. 47—48].

На з'ездзе была ацэнена антырэлігійная праца СВБ за гады яго існавання. Так, Я. Яраслаўскі адзначыў, што за гэтыя гады «арганізацыя якасна палепшылася і якасна ўзрасла, разгарнулася і палепшылася навучальна-выхаваўчая прапаганда сярод нацыянальнасцей, выдадзены шэраг дапаможнікаў і падручнікаў па антырэлігійнай прапагандзе, пашырыўся і палепшыўся антырэлігійны друк, уцягнуты ў антырэлігійную прапаганду шэраг навуковых і грамадскіх арганізацый, узмацнілася сувязь ЦС СБ з мясцовымі арганізацыямі». Былі адзначаны і недахопы ў антырэлігійнай працы, якія складаліся ў нязначнай падтрымцы з боку партыі, камсамола і іншых грамадскіх арганізацый, што выявілася ў слабым размаху антырэлігійнай прапаганды сярод насельніцтва. Па меркаванні Я. Яраслаўскага, «каб выканаць па-сапраўднаму свае мэты і задачы, СВБ павінен звязаць сваю працу з агульнымі задачамі класавай барацьбы. Адсюль сама сабой выцякае і пастаноўка задач агітацыі і прапаганды. СВБ не з'яўляецца вузкапрапагандысцкім аб'яднаннем. Гэта масавая арганізацыя для практычнай барацьбы з рэлігіяй» [5, с. 13—14].

На з'ездзе выступілі акрамя кіраўнікоў СВБ дзеячы камуністычнай партыі: М. І. Бухарын, А. В. Луначарскі, У. У. Маякоўскі, Д. Бедны, М. Горкі [4, арк. 47]. Так, М.І. Бухарын, якія выступаў з дакладам пад назвай «Рэканструктыўны перыяд і барацьба з рэлігіяй», быў згодны з тым, што неабходна ўзмацненне антырэлігійнай барацьбы, але метады гэтай барацьбы, на яго думку, павінны былі быць іншымі, чым у І. В. Сталіна і Я. Яраслаўскага: «Трэба выразна ведаць, што ёсць вялікая розніца паміж горадам і вёскай, паміж селянінам і рабочым… Заданне не ў тым, каб «націснуць», а ў тым, каб пераканаць». У антырэлігійнай дзейнасці Бухарын бачыў працяглую, паступовую барацьбу, а не хуткую і рэпрэсіўную атаку. Спачатку даклад Бухарына быў нават выдадзены асобнай брашурай, але ўжо ў жніўні 1929 года Палітбюро ЦК партыі пры абмеркаванні даклада

© Казлова Н. І., 2017

Рэпазіторый БарДУ

прыйшло да высновы, што ў ім прасочваюцца акцэнты крытыкі і недаверу да генеральнай ліні партыі. Пасля гэтага артыкулы М. І. Бухарына ў савецкім друку перасталі публікаваць [6, с. 132].

Так, 10 чэрвеня 1929 года на з'ездзе выступіў і М. Горкі з заклікам да наступлення на рэлігію. Аднак ён адзначаў, што «многія адносяцца да антырэлігійнай працы як да справы паўсядзённай, простай, калі гэта справа зусім не простая, а вельмі важная, паколькі прыходзіцца вытраўліваць з жыцця тое, што ўкаранялася на працягу 20 стагоддзяў» [7]. Працяглы даклад быў у А. В. Луначарскага. Так, ён адзначаў, што «трэба паказаць на практыцы сялянам, што тая рэлігія, якая на словах нібыта такая высокая, на самой справе крывадушным спосабам прыкрывае парокі буржуазіі, дробнай буржуазіі, прывілася ў сілу неадукаванасці народнай масы. Трэба ўсяму гэтаму супрацьпаставіць нашыя нормы жыцця, так як мы іх разумеем» [8, с. 496]. Здзеклівай была прамова У. У. Маякоўскага. Ён падкрэсліў, што раней, да рэвалюцыі, усе выступленні суправаджаліся словамі «з Богам!», а ён прапанаваў з'езд закрыць словамі «на Бога!» [9, с. 377].

Трэба адзначыць, што з'езд прыняў адразу некалькі рэзалюцый («Аб сектанцкім руху», «Аб працы сярод моладзі», «Аб працы ў вёсцы», «Аб працы ў Чырвонай арміі», «Аб працы сярод жанчын», «Аб друку», «Па школьнай і дзіцячай працы» і т. п.), у якіх адзначалася аб неабходнасці пашырэння і распаўсюджвання ідэй атэізму; стварэння большай колькасці ячэек СВБ, антырэлігійных музеяў і іншых устаноў; пашырэння тыражу антырэлігійнай літаратуры [10, с. 108]. З'езд абраў Цэнтральны савет з прыкладна 96 членаў (да з'езду іх было 40). Ён, у сваю чаргу, абраў выканкам у складзе 22 чалавек, такіх як Я. Яраслаўскі, П. А. Красікаў, Я. А. Тучкоў. Была прынята новая рэдакцыя Статута СВБ. Так, членам саюза можна было стаць не з 18 гадоў, як гэта было згодна са Статутам СБ 1925 года, а з 14 гадоў. Адбылося афармленне дзіцячага бязбожнага руху ў арганізацыю «Юных ваяўнічых бязбожнікаў СССР» (ЮВБ). У групы юных бязбожнікаў выраšылі прымаць з 8 гадоў. Для школьнікаў з чатырнаццацігадовага ўзросту ствараліся школьныя ячэйкі СВБ [11, с. 336]. У цэлым з'езд стаў мяжой, пасля якой павелічэнне колькасці членаў арганізацыі пайшло з яшчэ большай сілай. Так, калі на 1 студзеня 1926 года у саюзе было 87 тыс. членаў, а на 1 студзеня 1929 года — 465 тыс., то толькі за 1929 год СВБ вырас да 700 тыс. [6, с. 132].

Што датычыцца падрыхтоўкі антырэлігійных кадраў, то гэтым займаліся камуністычныя акадэміі, інстытуты, курсы, семінары. Так, восенню 1929 года ў некаторых абласных і акруговых цэнтрах былі адкрыты антырэлігійныя факультэты пры рабфаках. У студзені 1929 года на гістарычным аддзяленні факультэта мовазнаўства і матэрыяльнай культуры ў Ленінградскім дзяржаўным універсітэце былі адкрыты двухгадовыя курсы па антырэлігійнай падрыхтоўцы [12, с. 55].

Змянілася і сама структура СВБ — былі створаны аддзелы: агітацыйна-масавы, межрабсувязі, інфарсектар, нацаддзел, школьна-піянерскі [11, с. 336]. У арганізацыйным плане быў узяты курс на рэзкае павелічэнне колькасці «ваяўнічых бязбожнікаў»: «не сотні тысяч рабочых, сялян і чырвонаармейцаў павінны быць прыцягнуты да СВБ, а мільёны». Таксама на з'ездзе адзначалася, што «не павінна быць ніводнага прадпрыемства, ніводнага саўгаса, калгаса і часцей Чырвонай арміі без ячэйкі СВБ, не павінна быць ніводнай школы без такой ячэйкі, не павінна быць ніводнага піянерскага атрада без дзіцячай групы бязбожнікаў» [3].

**Заключэнне.** Атрымаўшы падтрымку ад партыі, СВБ становіцца не проста грамадскай арганізацыяй, а так званым правадыром дзяржаўнай палітыкі ў галіне антырэлігійнай працы. На II з'ездзе СБ, які праходзіў у атмасферы рэзкай нецярпімасці да рэлігіі, быў прыняты шэраг важных рашэнняў, аналіз якіх паказвае, што антырэлігійная прапаганда набывала новыя рысы. Такім чынам, у 1929 годзе адначасова СВБ узяў напрамак на разгортванне масавай антырэлігійнай працы са шматлікімі групамі насельніцтва, і ў антырэлігійнай працы адбыўся пераход ад умераных да адміністрацыйна-камандных метадаў.

### Спіс цытаваных крыніц


1. *Поспеловский, Д. В.* Русская православная церковь в XX веке / Д. В. Поспеловский. — М. : Республика, 1995. — 511 с.
2. Протокол заседания Президиума Окрсовета «Безбожников» от 14. 03. 1929 г. // ГАООГО. — Ф. 253. Оп. 3а. Д. 20. Л. 1—3.
3. *Фирсов, С. Л.* Была ли безбожная пятилетка? [Электронный ресурс] / С. Л. Фирсов. — Режим доступа: http://www.atheism.ru /library/Firsov_1.phtml . — Дата доступа: 13.01.2017.
4. Краткий информационный бюллетень II Всесоюзного съезда Союза Безбожников СССР // ГАООГО. — Ф. 69. Оп. 2. Д. 572. Л. 47—55.
5. *Ярославский, Е.* На одном из боевых участков / Е. Ярославский // Антирелигиозник. — 1929. — № 7 (17). — С. 11—19.
6. *Слезин, А. А.* Антирелигиозное наступление советского государства в 1927—1929 гг. / А. А. Слезин // Проблемы политики и общества. — 2013. — № 5. — С. 125—189.
7. *Горький, М.* Речь на открытии II Всесоюзного съезда воинствующих безбожников [Электронный ресурс] / М. Горький. — Режим доступа: http://home.mts-nn.ru/~gorky/TEXTS/OCHST/bezgott.txt . — Дата доступа: 22.02.2017.
8. *Луначарский, А. В.* Второй съезд Союза воинствующих Безбожников СССР / А. В. Луначарский // Религия и просвещение / сост. Кузнецов. — М. : Совет. Россия, 1985. — 546 с.
9. *Маяковский, В. В.* Выступление на Втором Всесоюзном съезде Союза воинствующих безбожников 10 июня 1929 года / В. В. Маяковский // Полное собрание сочинений : в 13 т. / АН СССР, Ин-т мировой лит. им. А. М. Горького. — М. : Художеств. лит., 1955—1961. — Т. 12. — 1959. — С. 376—377.
10. *Алексеев, В. А.* Иллюзии и догмы / В. А. Алексеев. — М. : Политиздат, 1991. — 400 с.
11. *Шишаков, В.* Союз воинствующих безбожников / В. Шишаков // Воинствующее безбожие в СССР за 15 лет. — М, 1932. — С. 335—338.
12. *Оленщук, Ф.* 10 лет работы СВБ / Ф. Оленщук // Безбожник. — 1936. — № 1 (12). — С. 55.


Репозиторий БарГУ